Секцыя:
«ГІСТАРЫЧНЫЯ ПЕРАДУМОВЫ ГРАМАДЗЯНСКАЙ СУПОЛЬНАСЦІ»

Агееў А. Р.
г. Магілёў, УА «МДУ імя А.А. Куляшова»

БАРАЦЬБА ЗА АДРАДЖЭННЕ МАГІЛЁЎСКАЙ РАТУШЫ: ГІСТОРЫЯ І ЎРОКІ

Адбудова магілёўскай ратушы стала галоўнай гарадской падзеяй 2008 г. Да яе адкрыцця была выдадзена кніга «Магілёўская ратуша. Гістарычны лёс і адраджэнне»[1]. Тым не менш, многія праблемныя пытанні, якія ўзнікалі пад час прыняцця рашэння аб яе аднаўленні не знайшлі ў кнізе свайго адлюстравання ў сувязі з падарачным фарматам выдання.

Нягледзячы на пастановы аб рамонце ратушы, працы не былі завершаны, а яе будынак улады зруйнавалі ў 1957 годзе. Чым больш праходзіла часу з моманту разбурэння ратушы, тым больш станавілася зразумелым, якую каштоўнасць страціў горад. У 1975 годзе, менш чым праз 20 гадоў з дня разбурэння ратушы, пачалася распрацоўка праекта яе аднаўлення. Пасля правядзення Алегам Трусавым археалагічных раскопак, архітэктар Я. Ханіна распрацавала праект гістарычнай рэканструкцыі, які быў высока ацэнены спецыялістамі, але не быў здзейснены.

Палітыка перабудовы і галоснасці, якую праводзіла кіраўніцтва СССР у другой палове 1980-х гадоў, спрыяла росту цікавасці грамадства да сваёй гістарычнай спадчыны. Сімвалічна, што напрыканцы існавання СССР каля падмуркаў ратушы і ганку Дома культуры будтрэста № 12 (Палац шлюбу) адбываліся першыя несанкцыянаваныя камуністычнымі ўладамі мітынгі. Як і ў магдэбургскія часы, гараджане збіраліся на традыцыйным спакон веку месцы збору каля ратушы. На мітынгах гучалі новыя нязвыклыя для савецкіх часоў словы аб сапраўднай дэмакратыі, аб неабходнасці рэабілітацыі ворагаў народу, адраджэння гістарычнай памяці і мовы, перадачы вернікам адабраных раней храмаў. Менавіта тут нараджаўся дэмакратычны рух на Магілёўшчыне, выступалі маладыя магілёўскія палітыкі новай хвалі: Віталь Васількоў, Сяргей Габрусеў, Уладзімір Голуб, Наталля Рослава, Анатоль Фёдараў і інш. Выступалі і многія вядомыя затым палітычныя дзеячы агульнабеларускага маштабу, як, напрыклад лідэр Беларускага народнага фронту Зянон Пазняк, будучы Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка.

Важнай падзеяй, якая паўплывала на грамадскую думку ў Магілёве, стала выданне з 1989 года грамадска-палітычнай штотыднёвай газеты «Ратуша». Сама назва выдання была сімвалічнай і спрыяла замацаванню ў свядомасці маладзейшых гараджан Магілёўскай ратушы як сіноніма страчанай у савецкія часы спадчыны, сімвала і нават брэнда горада. Пазіцыя дзеячаў грамадскага руху таго часу спрыяла падтрымцы ідэі адбудовы будынка ратушы тагачасным старшынёй выканаўчага камітэта горада Сяргеем Габрусевым. У выніку гарадскія ўлады прынялі рашэнне аб аднаўленні сімвала гарадскога самакіравання. На гістарычным месцы, дзе ратуша прастаяла амаль тры стагоддзі, быў выкапаны катлаван, і 23 мая 1992 года адбылася сімвалічная

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

закладка першага каменя будынка. Асвяціў і благаславіў адраджэнне ратушы архіепіскап Магілёўскі і Мсціслаўскі Максім.

Непасрэдна пачаткам будаўніцтва кіраваў начальнік управлення рэстаўрацыі і кансервацыі помнікаў гісторыі і культуры магілёўскага аблвыканкама Аляксандр Чачора. У 1992 годзе было засвоена каля 1 млн руб. і выведзены нулявы цыкл. Але, як часцяком бывае, добрая справа не адразу пайшла лёгка. Распад СССР, цяжкасці пераходнага перыяду не дазволілі так хутка, як жадалася грамадскасці, аднавіць ратушу. З-за недахопу сродкаў і палітычнай волі ва ўмовах сістэмнага крызісу работы былі надоўга прыпынены.

Працягу адбудовы ратушы ў канцы 1990-х гадоў пры новых кіраўніках гарадскога выканаўчага камітэту замінала дачыненне да першай спробы адраджэння ратушы Сяргея Габрусева. Ён ўспрымаўся магілёўскай наменклатурай, як апазіцыянер і чалавек з іншай «каманды», што часткова было праўдай. Тое, што ідэю працягвалі падтрымліваць практычна ўсе магілёўскія апазіцыйныя палітычныя партыі і рухі, толькі ўзмацняла недавер да яе.

Нягледзячы на няўдачу першай спробы аднаўлення, надзея на адраджэнне гарадской святыні жыла ў сэрцах магілёўцаў. Вельмі важна, што практычна ўся культурная эліта горада падтрымлівала ідэю. Некалькі разоў магілёўская грамадскасць праводзіла збор подпісаў з прапановай адрадзіць дыямент магілёўскага грамадзянскага дойлідства. Не дазвалялі забыцца на неабходнасць адбудовы мясцовыя журналісты. Магілёўскія гісторыкі і краязнаўцы ў 1990-я гады XX і першыя гады XXI стагоддзяў не раз у рэзалюцыях навуковых канферэнцый звярталіся да органаў улады з прапановамі па адбудове будынка ратушы.

Высілкі магілёўскай культурнай эліты не былі дарэмнымі. Макеты, малюнкі ратушы сталі неад'емнай часткай экспазіцый магілёўскіх музеяў. У лістападзе 2005 года ў музеі гісторыі Магілёва была ўрачыста адкрыта створаная пры дапамозе амбасады ЗША экспазіцыя «Магілёў часоў Магдэбургскага права XVI-XVIII стагоддзяў». Паступова ратуша зноў стала сапраўдным архітэктурным сімвалам Магілёва, а яе сілуэт стаў пазнавальным для ўсіх, у тым ліку і маладзейшых, пакаленняў гараджан.

Нам уяўляецца, што сапраўдныя зрухі ў адносінах кіраўніцтва горада да адбудовы змяніліся пасля таго, як грамадскасць пачала крыху спекуляваць тэзісам: «Мэр, які адбудуе ратушу, станоўчым героем увойдзе ў гісторыі Магілёва». Кіраўнік магілёўскай вертыкалі Віктар Шорыкаў таксама разумеў, што пытанне адраджэння ратушы справа часу. Пад уплывам грамадскай думкі гарадскія ўлады ў пачатку XXI стагоддзя вярнуліся да ідэі яе адраджэння. Прапанову старшыні Магілёўскага гарвыканкама па адбудове помніка падтрымаў старшыня абласнога выканаўчага камітэта Барыс Батура. У маі 2004 года гарадскі выканаўчы камітэт даў дазвол на праектаванне, а ў студзені 2005 года было выдадзена архітэктурна-планіровачнае заданне на аднаўленне помніка архітэктуры на яго спрадвечным месцы.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Генеральным праекціроўшчыкам выступіла ТАА «Цэнтр па рэгенерацыі гісторыка-культурных ландшафтаў і тэрыторый». У аснову праекту былі пакладзены гістарычныя дакументы і матэрыялы, гістарычная даведка і археалагічная справаздача імя Трусава, праект 1985 года архітэктара імя Ханінай. З дапамогай камп'ютарнай апрацоўкі старых фотаздымкаў былі ўдакладнены памеры і прапорцыі фасадаў і архітэктурнага дэкору. Новы праект прайшоў узгадненне ва ўпраўленні па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і рэстаўрацыі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Праект прадугледжваў адкрыццё будынка для наведвання і адначасова захоўваў першапачатковую функцыю ратушы – месца размяшчэння органаў гарадскога самакіравання. Было вырашана на першым паверсе будынка размясціць залы Музея гісторыі Магілёва, на другім – залу пасяджэнняў гарадскога Савета, урачыстых прыёмаў і цырымоній.

Напачатку меркавалася, што адроджана ратуша будзе да 740-й гадавіны меркаванай даты заснавання Магілёва. Але фінансавая напружанасць гарадскога бюджэту ўвесь час адсоўвала рэальны пачатак будаўніцтва ратушы. Нават ў гэты момант лёс праекта яшчэ не быў прадвызначаны. У гарадскіх уладаў існавалі пэўныя сумненні ў станоўчай рэакцыі магілёўцаў на факт будаўніцтва помніка ва ўмовах незавершанасці рэалізацыі шэрагу сацыяльных праектаў.

На наш погляд, вельмі важным момантам, які паўплываў на тэрмін пачатку адбудовы помніка, стаў чарговы збор подпісаў за адраджэнне ратушы падчас свята горада ў канцы чэрвеня 2007 года. Яго правяла група неабыякавых да магілёўскай гісторыі хлопцаў і дзяўчат, сярод якіх было некалькі актывістаў апазіцыйных партый. Сем чалавек сабралі за тры святочныя дні каля дзвюх тысяч подпісаў магілёўцаў і пазней перадалі іх дэпутатам на сесіі гарадскога савета дэпутатаў. Не паспела апазіцыя перадаць свае подпісы, як ідэю вырашылі перахапіць апаненты. Літаральна праз тыдзень арганізацыя БРСМ выступіла з ініцыятывай правядзення акцыі «Будуем ратушу разам». Барацьба за ініцыятыву пайшла толькі на карысць справе.

Пасля збору подпісаў на старонках гарадской газеты «Веснік Магілёва» па ініцыятыве гарадскога Савета дэпутатаў была распачата дыскусія па пытанні неабходнасці аднаўлення ратушы. Але сапраўднай дыскусіі не атрымалася. Рэакцыя культурных аб'яднанняў, жыхароў горада, якія выказваліся на старонках мясцовага друку, на ідэю адраджэння ратушы аказалася надзвычай станоўчай. Магілёўскі выканаўчы камітэт і гарадскі Савет дэпутатаў 3 жніўня 2007 года арганізавалі пасяджэнне круглага стала на чале з старшынёй Савета Валерыем Свістуновым з шырокім удзелам прадстаўнікоў грамадскасці, кіраўнікоў гарадскіх сродкаў масавай інфармацыі. Прысутныя аднадушна падтрымалі зварот грамадзян аб аднаўленні ратушы. Пытанне было разгледжана на сумесным пасяджэнні прэзідыума гарадскога савета і яго пастаянных камісій і вынесена на сесію гарадскога савета.

Разгледзеўшы звароты грамадзян, грамадскіх аб'яднанняў, прапановы круглага стала, якія падтрымаў гарвыканкам, нягледзячы на складанасць

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

выканання бюджэту горада, гарадскі савет дэпутатаў на сваёй сесіі 8 жніўня 2007 года прыняў рашэнне пачаць аднаўленне ратушы ўжо ў 2007 годзе, выдзеліць з гарадскога бюджэту неабходныя сродкі для завяршэння вырабу праектна-каштарыснай дакументацыі і пачатку будаўніцтва. Дэпутаты звярнуліся ў абласны выканаўчы камітэт з просьбай уключыць аб'ект у абласную інвестыцыйную праграму 2008-га года.

Аднаўленне найвышэйшага дасягнення магілёўскага гарадскога дойлідства пачалося летам 2007 года, праз паўстагоддзя пасля яго варварскага знішчэння. Гарвыканкам даверыў будаўніцтва аб'екта ААТ «Прамжылбуд». Яе кіраўніком стаў начальнік участка Міхаіл Міхалап. Непасрэдна курыравалі будаўніцтва старшыня гарвыканкама Віктар Шорыкаў і яго намеснік Уладзімір Ціток. Ужо ў жніўні на аб'екце распачаліся будаўнічыя работы.

Нягледзячы на ўзнікаўшыя праблемы, будынак ратушы набываў свае спрадвечныя рысы. У аддзеле ідэалогіі гарвыканкама быў падрыхтаваны на беларускай мове зварот да будучых пакаленняў ад імя жыхароў горада. 23 лістапада 2007 года ва ўрачыстай цырымоніі, звязанай з пачаткам адраджэння гарадской ратушы, прыняў удзел Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка. Пасля гэтай акцыі можна было быць упэўненым, што будаўніцтва аб'екта будзе завершана. Але менавіта пры закладцы прагучала дата адбудовы – адзін год, пры праектных двух. Надалей гэта выклікала шматлікія тэхналагічныя праблемы. Праектная дакументацыя перманентна не паспявае да новага графіка работ. Галоўны архітэктар наракаў на нізкую якасць работ і кваліфікацыю будаўнікоў, з-за чаго ўвесь час неабходна карэктаваць чарцяжы. Тым не менш, працы былі рэзка паскораны.

Нягледзячы на шматлікія вытворчыя праблемы будаўніцтва будынка ратушы было скончана да пачатку ліпеня 2008 года. Будаўнікі і выканаўчыя камітэты горада і вобласці зрабілі ўсё магчымае, каб пад час святкавання 3 ліпеня Дня горада для грамадскасці, а другі раз афіцыйна 18-га па прыездзе Прэзідэнта адбылося ўрачыстае адкрыццё страчанага ў 1957 годзе, а цяпер адроджанага шэдэўра грамадзянскай архітэктуры XVII стагоддзя.

Чаму ў адрозненні ад многіх іншых ініцыятыў беларускай грамадскасці, задума адрадзіць сімвал гарадскога самакіравання здзейснілася? Вельмі важна, што не толькі палітычная апазіцыя, а і практычна ўся культурная эліта горада падтрымлівала ідэю адраджэння страчанага помніка. Грамадскасць Магілёва ўдала выбрала аб'ект для змагання. Ён не супярэчыў пануючым настроям кіруючай наменклатуры.

Якія падказкі можа даць гісторыя адраджэння магілёўскай ратушы актывістам руху за захаванне і адраджэнне гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі? Па першае, рыхтавацца трэба не да штурму, а да доўгай асады. Нават такая бясспрэчная ідэя, як аднаўленне магілёўскай ратушы, здзяйснялася вельмі доўга. Аднаго збору подпісаў будзе відавочна замала. Па другое, неабходна перацягнуць на свой бок грамадскую думку, і тут без сродкаў масавай інфармацыі не абысціся. Паколькі яны амаль усе дзяржаўныя, то трэба разумець і трэцяе: ідэя павінна быць пазітыўнай і для сённяшняй улады, як

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

рэспубліканскай, так і канкрэтнага гораду ці рэгіёну. Уменне працаваць рознымі метадамі з чыноўнікамі, тут нельга абмяжоўвацца толькі крытыкай ці толькі просьбамі, таксама важны чыннік поспеху.

У Магілёве да гэтага часу не прыпыняюцца спрэчкі на тэму, хто выйграў ад будаўніцтва ратушы: апазіцыя і грамадскія актывісты ці ўлада? Калі ўдумацца не ангажавана, то выйгралі ўсе.

Літаратура

1. Агееў, А.Р., Трусаў, А.А. Магілёўская ратуша. Гістарычны лёс і адраджэнне / Аляксандр Агееў, Алег Трусаў. – Магілёў: Магіл. абл. узбуйн. друк., 2008. – 144 с.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова